**Матырка, В.** Паўтара года ў Баграме / В. Матырка // Лепельскі край. — 2019. — 2 жн. — С. 3.

# ПАЎТАРА ГОДА Ў БАГРАМЕ

*У 1960-х – пачатку 1970-х гадоў паветрана-дэсантныя войскі СССР яшчэ не набылі сваю славу. Моладзь лічыла гонарам службу на флоце. Аднак у другой палове 1970-х гадоў сітуацыя карэнным чынам мяняецца, дэсантнікі паступова выходзяць на першыя месцы ў плане прэстыжнасці службы.*



Гэтаму ў значнай ступені спрыяла даручэнне і паспяховае выкананне складаных і рызыкоўных аперацый. Не выпадкова савецкія дэсантнікі аднымі з першых былі накіраваны ў Афганістан і яны ж складалі касцяк абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў. У тых дэсантных часцях служыла і даволі шмат лепяльчан.

Віктар Парахонька з вёскі Дражна да прызыву на службу скончыў Стайскую васьмігодку, затым – Мінскае ПТВ-107, дзе атрымаў спецыяльнасць электрамеханіка, і ўладкаваўся на працу ў Мінск. У 1985 годзе хлопца прызвалі ў армію.

Віктара разам з такімі ж навабранцамі накіравалі ў горад Тэрмез Туркменістанскай ваеннай акругі. Пасля Беларусі з яе прахалодай Узбекістан сустрэў нашых воінаў спёкай і духатой, якія толькі ўзмацняліся.

Шэсць месяцаў у вучэбнай часці былі запоўнены напружанымі трэніроўкамі і заняткамі. Пешыя пераходы чаргаваліся з агнявой падрыхтоўкай, трэніроўкамі на баявой тэхніцы. Да 1985 года камандаванне Савецкай арміі зразумела, што ў Афганістане сутыкнулася з жорсткім, умелым, зацятым праціўнікам, які вядзе вайну на сваёй зямлі. Зразумела, што падзеі ў далекай паўднёвай краіне – гэта не лакальны інцыдэнт, а сапраўдная вайна. Таму навучанню папаўнення ўдзялялася максімальная ўвага, маладым салдатам перадавалі вопыт вопытныя байцы і камандзіры, якія самі да гэтага не адзін месяц правялі ў Афганістане, многія мелі баявыя ўзнагароды.

Віктара размеркавалі для праходжання далейшай службы ў знакаміты 345-ы парашутна-дэсантны полк, які размяшчаўся ў Баграме. Яго асноўнай задачай была абарона аэрапорта.

Аэрапорт Баграма з’яўляўся тады і раней буйнейшай паветранай брамай краіны. Яго ўзлётна-пасадачная паласа дазваляе прымаць самыя цяжкагрузныя ваенна-транспартныя самалёты. Знаходзіцца ў цэнтры краіны, усяго ў 60 кіламетрах ад сталіцы – горада Кабула. Таму аб’ект мае стратэгічнае значэнне. Вакол аэрапорта дэсантнікі наладзілі ўмацаваныя пазіцыі, адным з важнейшых складнікаў з’яўлялася артылерыя.

Так, паветрана-дэсантныя войскі СССР былі аснашчаны не толькі лёгкай стралковай зброяй. Яны мелі і сваю ўласную артылерыю, прадстаўленую ў асноўным 122-міліметровымі гарматамі мадэлі Д-30. Іх адметнасцю была закладзеная канструктарамі здольнасць весці кругавы абстрэл. Напрыклад, калі праціўнік нападае справа ці злева, разліку гарматы іншай мадэлі трэба падняць станіны і развярнуць яе, на што затрачваюцца каштоўныя ў час бою секунды. А Д-30, не мяняючы пазіцыі, хутка разварочвала ствол на 360 градусаў і заўсёды была гатовая сустрэць ворага агнём. Віктар Парахонька ўспамінаў, што душманы рэгулярна непакоілі, імкнуліся падабрацца з навакольных гор і абстраляць аэрапорт з гранатамётаў, а то і запусціць ракету па самалёце. Нашы дэсантнікі тут жа разварочвалі гарматы, давалі некалькі залпаў (наваколле ўжо было добра прыстралянае), а потым мабільныя групы праводзілі зачыстку мясцовасці. Віктара прызначылі камандзірам гарматнага разліку, на рахунку якога было не адно трапнае пападанне.

Так прайшлі паўтара года службы дэсантніка Віктара Парахонькі: з красавіка 1986 па кастрычнік 1987 гадоў. Дзяжурствы, трэніроўкі, баявая стральба – звычайная праца на вайне.

Пасля звальнення ў запас Віктар Дзмітрыевіч вярнуўся на Лепельшчыну. Зараз жыве ў аграгарадку Стаі, а працуе электрамеханікам на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Праўда, па вахтах і мандзіроўках даводзіцца рэгулярна ездзіць.

– Другога жніўня ветэраны-афганцы, сярод якіх вельмі шмат дэсантнікаў, будуць адзначаць і свае свята, кажа старшыня раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Сяргей Крывель. – Я віншую ўсіх, хто меў і мае дачыненне да крылатай пяхоты, жадаю ўсім здароўя і толькі мірнага неба над нашай Беларуссю.

**Васіль МАТЫРКА**